5. *Шолохов С. В.,* Коммерческая организация как орудие преступления // Следователь. – 2003 – №6(62) – С.13 – 14.

# КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ НЕПАЎНАЛЕТНІХ НА БЕЛАРУСІ Ў САВЕЦКІ І СУЧАСНЫ ПЕРЫЯДЫ

**С. А. Гур'еў**

Пытанне аб адказнасці непаўналетніх рэгламентавалася законам на Беларусі ў даволі старажытны перыяд, яшчэ да Статутаў ВКЛ. У Статуце 1566 г. адказнасць усталёўвалася з 14 гадоў, па Статуту 1588 г. з 16-ці. Гэта была гістарычная традыцыя, якая працягвалася і далей.

Пасля 1917 г. на Беларусі дзейнічала расійскае заканадаўства. Дэкрэт СНК РСФСР ад 14 студзеня 1918 г. абвясціў адмену судовага разгляду спраў непаўналетніх і іх адказнасць у форме турэмнага зняволення. Справы аб непаўналетніх ва ўзросце да 17 гадоў, здзейсніўшых грамадска небяспечнае дзеянне, падлягалі разгляду камісіі па справах непаўналетніх, якая павінна была альбо вызваляць іх, альбо накіроўваць у адно з прыстанішчаў Народнага камісарыята грамадскага нагляду адпаведна характару дзеяння. Увогуле, камісіі па справах непаўналетніх былі створаны ў 1918 годзе і займаліся ліквідацыяй дзіцячай беспрытульнасці і аховай правоў непаўналетніх, згодна з Палажэннем аб камісіях па справах непаўналетніх [1, с. 100-105]. Крымінальны кодэкс РСФСР 1922 г., што спачатку неафіцыйна выкарыстоўваўся судовымі органамі БССР, а потым, летам 1922 г. быў афіцыйна распаўсюджаны на тэрыторыю Беларусі, у арт. 18 усталяваў, што пакаранне не прымяняецца да малалетніх да 14 гадоў, а таксама ўсіх непаўналетніх ад 14-ці да 16-ці гадовага ўзросту, у адносінах да якіх было прызнана магчымым абмежавацца мерамі медыка-педагагічнага ўздзеяння. Патрэбна адзначыць, што да канца 20-х гадоў захоўваўся прыярытэт прымусовых і выхаваўчых мераў перад мерамі крымінальнага пакарання адносна непаўналетніх.

Нягледзячы на стварэнне у 1919 г. Беларускай ССР і прыняцце Крымінальнага кодэкса БССР 1928 г., на тэрыторыі Беларусі працягвалі дзейнічаць нарматыўныя акты РСФСР, а потым СССР. У 30-я гады ўзмацніўся рэпрэсіўны характар савецкай дзяржавы. У сувязі з гэтым адносна непаўналетніх Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7 красавіка 1935 г. «Аб мерах барацьбы са злачыннасцю непаўналетніх» была ўсталявана крымінальная адказнасць асобаў, пачынаючы з 12-гадовага ўзросту. За здзяйсненне крадзяжоў, прычыненне гвалту, цялесных пашкоджанняў, калецтваў, забойства ці спробы забойства вінаватыя ў гэтых злачынствах прыцягваліся да суда з прымяненнем усіх мераў крымінальнага пакарання, у тым ліку і расстрэла, хаця сведкаў прымянення вышэйшай

меры пакарання да 12-гадовых падлеткаў не маецца. У гэтым выпадку ўзнікла калізія з агульнай нормай аб расстрэле, па якой гэтая мера крымінальнага пакарання магла прымяняцца да правапарушальнікаў, дасягнуўшых 14 гадоў. Пазней гэтая спрэчка была вырашана на аснове Цыркуляра Пракуратуры СССР, дзе пацвяржалася непрымяненне смяротнага пакарання да непаўналетніх.

У 1935 г. быў адменены арт. 8 Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік 1924 г., які даваў права прымяняць да непаўналетніх меры медыка-педагагічнага характара. Пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерах па ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці і безнагляднасці» ад 31 мая 1935 г. былі ліквідаваны камісіі па справах непаўналетніх, якія былі зноў створаны толькі ў 1961 годзе.

Перад Вялікай Айчыннай вайной 31 мая 1941 г. Пастановай Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР было ўсталявана, што непаўналетнія, дасягнуўшыя 14 гадоў, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці ва ўсіх выпадках.

У часы Вялікай Айчыннай вайны і ў першыя пасляваенныя гады асноўнымі крымінагеннымі ўмовамі злачыннасці непаўналетніх былі беспрытульнасць і безнагляднасць, а таксама іх цяжкае матэрыяльнае становішча. Пастановай СНК СССР ад 23 студзеня 1942 г. «Аб уладкаванні дзяцей, якія засталіся без бацькоў» было прадугледжана стварэнне пры выканкамах мясцовых Саветаў камісій па ўладкаванню дзяцей, якія засталіся без бацькоў, павялічэнне колькасці дзіцячых дамоў, прытулкаў-размеркавальнікаў, стварэнне сувораўскіх школ.

У пазнейшы перыяд Асновамі крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, прынятымі Вярхоўным Саветам СССР 25 снежня 1958 г. і распрацаванымі на іх аснове крымінальнымі кодэксамі саюзных рэспублік, быў павышаны ўзрост, па дасягненні якога наступала крымінальная адказнасць. Згодна артыкулу 10 Асноў, адказнасці падлягалі асобы, якім споўнілася 16 гадоў да здзяйснення злачынства. За забойства, наўмыснае нанясенне цяжкіх пашкоджанняў, якія прычынілі шкоду здароў’ю, згвалтаванне, разбойны напад, крадзеж, злоснае ці асабліва злоснае хуліганства, наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай, грамадскай маёмасці ці ўласнай маёмасці грамадзян, якія паўлеклі цяжкія наступствы, а таксама наўмыснае здзяйсненне дзеянняў, што маглі выклікаць крушэнне цягніка – крымінальная адказнасць наступала з 14 гадоў [2]. Пры вызначэнні пакарання непаўналетнему, які ўпершыню пазбаўляўся волі на тэрмін да 3 гадоў, суд мог з улікам характара і ступені грамадскай небяспечнасці злачынства, асобы

падсуднага і іншых абставін справы, а таксама магчымасці ягонага выпраўлення і перавыхавання без ізаляцыі ад грамадства, мог адтэрмінаваць выкананне прыгавору аб пазбаўленні волі ў адносінах да такой асобы на тэрмін ад 6 месяцаў да 2 гадоў. У 1982 г. інстытут адтэрміноўкі прыгавору быў пашыраны на ўсіх злачынцаў.

Згодна з Асновамі крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік 1991, крымінальная адказнасць з 14 гадоў наступала таксама за крадзеж агнястрэльнай зброі, баявых прыпасаў ці выбуховых рэчываў і за крадзеж наркатычных рэчываў. Да непаўналетніх не прымянялася ссылка, высылка, пазбаўленне волі ў выглядзе турэмнага зняволення, смяротнае пакаранне і некаторыя іншыя меры пакарання. Заканадаўства арыентавала праваахоўчыя органы на пераважнае прымяненне мераў выхаваўчага характара, а не крымінальнага пакарання ў выпадках здзяйснення злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі. У якасці адной з прымусовых мераў выхаваўчага характара прадугледжвалася перадача непаўналетняга пад нагляд працоўнага калектыва, грамадскай арганізацыі ці асобнаму грамадзяніну, альбо прызначэнне грамадскага выхаваўцы ў адпаведнасці з Палажэннем аб грамадскіх выхаваўцах непаўналетніх.

Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, які быў прыняты ў 1999 г. і уведзены ў дзеянне з 1 студзеня 2001 года, у значнай меры дапоўніў прабелы і недахопы папярэдняга крымінальнага закона і ў большай стэпені адпавядаў задачам пабудовы сацыяльнай прававо дзяржавы і аховы грамадства ад злачынных пасягальніцтваў. У Кодэксе знайшлі непасрэднае адлюстраванне і замацаванне асноўныя прынцыпы і нормы міжнародных канвенцый, дагавораў і пагадненняў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь, у тым ліку і ў сферы злачыннасці непаўналетніх. Неабходнасць спецыяльных нормаў аб адказнасці непаўналетніх у крымінальным праве прама выцякае з агульных прынцыпаў справядлівасці і гуманізму [3].

Улічваючы асаблівасці псіхалогіі непаўналетніх, у дзеючы Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь быў уведзены спецыяльны раздзел «Асаблівасці крымінальнай адказнасці асобаў, здзейсніўшых злачынства ва ўзросце да 18 год», у якім улічана спецыфіка гэтай узроставай групы. У адпаведнасці з артыкулам 27 Кодэкса, «крымінальнай адказнасці падлягае асоба, якая дасягнула да часу здзяйснення злачынства 16-гадовага ўзросту». Частка 2 прадугледжвае канкрэтны пералік злачынстваў (21 пункт), за здзяйсненне якіх адказнасць наступае з 14-гадовага ўзросту.

Заканадаўца, зыходзячы з таго факта, што малалетні не можа ў поўнай меры асэнсоўваць фактычны характар і грамадскую небяспечнасць сваіх дзеянняў альбо кіраваць імі, ўсталяваў, што малалетнія, да 14-гадовага ўзросту не падлягаюць крымінальнай адказнасці.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. была пашырана сістэма пакаранняў, прымяняемых у адносінах да непаўналетніх шляхам уключэння ў яе меры пакарання ў выглядзе абмежавання волі, якое, аднак, можа прызначацца толькі ў тым выпадку, калі непаўналетні да дня пастанаўлення прыгавору дасягнуў 18-гадовага ўзросту (арт. 109). Акрамя таго, павялічыўся мінімальны тэрмін пакарання ў выглядзе арышту з 15 сутак да аднаго месяца. Пры гэтым было выключана ўказанне, што арышт можа прызначацца толькі да асобы мужчынскага полу. Гэтае пакаранне цяпер можа прымяняцца і да асобаў, не дасягнуўшых 16 гадоў.

У артыкуле 115 КК Рэспублікі Беларусь павялічаны максімальны тэрмін пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, якое можа прызначацца асобе, здзейсніўшай злачынства ва ўзросце да 18 гадоў. Калі раней такім тэрмінам было 10 гадоў, то зараз – 15 гадоў, у выпадку здзяйснення асабліва цяжкага злачынства, спалучанага з наўмысным пасягальніцтвам на жыццё чалавека. Дадзеным Законам быў таксама павялічаны тэрмін пазбаўлення волі з 15 да 20 гадоў пры прызначэнні канчатковага пакарання непаўналетняму па сукупнасці прыгавораў.

Указаныя наваўводзіны з усёй відавочнасцю сведчаць аб тым, што КК Рэспублікі Беларусь у рэдакцыі Закона ад 4 студзеня 2003 г. значна ўзмацніў крымінальную адказнасць непаўналетніх, што ў параўнанні з КК 1960 г., не дазваляўшым прызначэнне ім пазбаўлення волі звыш 10 год ні пры якіх абставінах, выглядае некалькі адыёзна. Аднак судовая практыка, як сведчаць статыстычныя дадзеныя, кіруецца пакуль склаўшыміся традыцыямі, выкарыстоўваючы сярэднюю велічыню тэрмінаў пазбаўлення волі (2,3,5 год) і не перавышаючы мяжу, якая ўстаялася для дадзенага пакарання.

**Літаратура**


6. *Нечаева А. М.* Правовая охрана детства в СССР / Отв. ред. В.П. Мозолин. М.: наука, 1987.
7. Основы уголовного законодательства Союза ССР и союзных республик: Закон СССР, 25 декабря 1958 г. // Ведомости Верховного Совета СССР, 1959, N 1, ст. 6.
8. *Саркисов Э. А.* Новое в Уголовном Кодексе Республики Беларусь // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000. Серия 200 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006.